Літоўскага, а аформіліся ў асобную этнічную групу, якая і зараз адрозніваецца ад карэннага насельніцтва Беларусі і Літвы.

## Литература


1. *Dlugodz J.* Bitva Grunwaldzka. Krakow: Nakldem Krakowskiej Spolki Wydawnicej.
2. The peoples of the Grand Duchy of Lithuania / Ed.: G.Potashenko; Transl. from the Lith.: A.Holvoet. Vilnius: Aidai, 2002.
3. *Бялявіна В. М.* Беларускія татары: аспекты этнракультурнай адаптацыі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. НАН Беларусі. Вып. 4 / рэд.-уклад. А.Г.Алфёрава. Мінск. 2008.
4. *Гембіцкая М. А.* Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі // Беларус. гіст. часоп. 2005. № 11.
5. *Гришин Я. Я.* Польско-литовские татары: взгляд через века. Казань: Татар. кн. изд-во, 2000.
6. *Думін С. У., Канапацкі І. Б.* Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. Мінск: Полымя, 1993.
7. *Захаркевіч С. А.* Традыцыйная культура этнічных меншасцей Беларусі ў XIV-XVIII стст. // Беларус. гіст. часоп. 2005. № 10.
8. Ипатьевская летопись / Предисл. Б. М. Клосса. [Репр. воспр.]. Москва: Яз. рус. культуры: Кошелев, 1998. (Полное собрание русских летописей).
9. *Канапацкі І. Б., Смолік А.І.* Гісторыя і культура беларускіх татар: вучэб. дапам. Бел. ун-т культуры. Мн.: БУК, 2000.
10. *Канапацкі І. Б.* Татары // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск, 2001. Т.6.
11. *Мухлинский А. О.* Исследование о происхождении и состоянии Литовских татар. [Репринт. изд.]. Минск: Беларус. кооп.-выд. т-ва «Адраджэньне», 1993.
12. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш.; АН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск: Беларусь, 1994.


# МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ У ГРАМАДСКАЙ ДУМЦЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XVI СТ.


**Я. С. Глінскі**


Грамадская думка Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. дала прыклад шэрагу варыянтаў стаўлення да мінулага і сучаснасці (а праз гэта і пошукаў шляхоў будучага развіцця).

Мэтай даследавання з’яўляецца раскрыццё сувязі паміж мінулым і сучасным у дыскурсе інтэлектуалаў ВКЛ XVI ст. Увага будзе засяроджана менавіта на «фармальных» праявах сувязі. Да іх адносяцца сімвалы і вобразы, праз якія здзяйсняецца сувязь, перавагі аўтараў у мінулым і сучаснасці, канструяванне імі схемы параўнання і структуры часу. Наўмысна пакінуты па-за межамі даследавання пытанні залежнасці ўяўленняў пра розныя часавыя пласты ад грамадскай пазіцыі аўтара, яго палітычнай арыентацыі і г. д. Дадзеная праца прысвечана прыватнаму

моманту азначвання [5, s.261] у грамадскай думцы XVI ст. пэўнага «знаку» – сувязі мінулага і сучаснага.

Параўнанне мінуўшчыны і сучаснасці займала значнае месца ў развагах грамадскіх дзеячаў ВКЛ XVI ст. Пры гэтым падстава для выкарыстання кампаратыўнага метаду магла быць рознай: з аднаго боку, праслаўленне сучаснага ўладара і сучаснага стану праз падкрэсліванне сувязі, пераемнасці з не менш выдатным гераічным мінулым (Ян Вісліцкі [1, сс.125, 157, 159]), а з іншага – выкрыванне заганаў сучаснасці, якія былі асабліва бачны на фоне той самай слаўнай мінуўшчыны (Мікола Гусоўскі [2, сс.50–51, 63–64], Міхалон Літвін [4, сс.63–65, 76–77, 93–94], Аўгустын Ратундус [10, ss.28–29, 42–43], Андрэй Волян [10, s.53], ананімны аўтар «Меркаванняў» [15, ss.350–352, 354], Мацей Стрыйкоўскі [12, s.250; 13, ss.147, 153, 157, 513 і далей]). Відавочна колькасная перавага скептыкаў у адносінах да сучаснасці, што не адпавядае агульнапрынятаму ў Еўропе ў эпоху Рэнесансу меркаванню аб перавазе свайго часу над ранейшай эпохай [9, s.25]. Гэта адлюстроўвае спецыфіку грамадскай думкі ВКЛ: у тых часах, якія для заходнееўрапейскіх інтэлектуалаў былі «сярэднявеччам», «цёмнымі вякамі», у ВКЛ бачылі «залаты век».

Далей, ніхто не ставіць пад сумненне станоўчыя характарыстыкі мінулага. У Ратунда, праўда, прысутнічае негатыўнае стаўленне да паганскіх часоў [10, s.24], але на агульную карціну станоўчай мінуўшчыны гэта не ўплывае. Справа ў тым, што толькі пэўная частка мінулага – гэта ідэал для Ратунда. Мяжой паміж адмоўным і станоўчым мінулым для яго з'яўляецца прыняцце хрысціянства. Таксама Стрыйкоўскі, калі разглядае розныя пласты мінулага, дужа разнастайны ў варыянтах ацэнкі: добрае «дамінулае» (тое, што было ў мінулым да пэўнага моманту, які таксама ўжо прайшоў) – дрэннае мінулае [12, s.399], дрэннае «дамінулае» – добрае мінулае [13, s.238], прыпадабненне [13, s.216]. Затое пры параўнанні з сучаснасцю храніст выбірае тыя эпізоды, якія кажуць на карысць мінулага.

Такое ўзвышэнне таго, што было калісьці, можа разглядацца як рытарычны прыём (так робіць у дачыненні верша А. Воляна «Да Палякаў і да Літвы» С.В. Кавалёў [3, с.28]). Але не варта прыніжаць і значэнне такога стаўлення да мінулага як праявы духоўных ўцёкаў ад няпростай рэчаіснасці ў мінулае (адна з формаў часавага эскапізму, гл. [14, s.267]).

Мінулае магло быць слынным праз адлюстраванне аднаго гераічнага вобразу. Так, у паэме Яна Вісліцкага «Пруская вайна» ім з'яўляецца Ягайла, які і акумулюе ў сабе цноты мінулага [1, с.125; 11, s.26]. У «Хроніцы» Мацея Стрыйкоўскага ў некаторых рытарычных закліках імя

Вітаўта фактычна робіцца сінонімам шчаслівага мінулага [13, s.157]. Але большасць аўтараў вызначылі параметры, па якіх ішло параўнанне. У такім выпадку маглі быць розныя рашэнні: ад шматаспектнага ахопу тэм для параўнання (Міхалон Літвін) да вылучэння аднаго параметру (у вершы «Да Палякаў і да Літвы» А. Воляна – гэта тэма уніі паміж Польшчай і ВКЛ). У рэшце рэшт, колькасць параметраў – вонкавы момант, сутнасць ва ўсіх (акрамя, натуральна, Вісліцкага) заставалася адной: сучаснасць саступала мінуламу. Характэрна, што аўтары з супрацьлеглымі палітычнымі поглядамі карысталіся аднолькавымі параметрамі для параўнання. Ратундус у «Размове паляка з літвінам» і Волян у «Да Палякаў і да Літвы» падмацоўваюць свае меркаванні тымі ж сімваламі («нашы продкі» [10, ss.28, 41]), канструкцыямі (досвед бліжэйшых родных, людзей слаўнага мінулага – бацькі, дзеда [10, s.29]), на якія іх апанент [6, s.V] Станіслаў Ажахоўскі абапіраўся пры доказе супрацьлеглых ідэй [7, s.65; 8, s.65]. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што вызначаная пераважная структура параўнання (добрае мінулае – дрэнная сучаснасць) была агульным месцам у свядомасці ВКЛ і Польшчы XVI ст. (хоць гэта не выключала магчымасці іншых варыянтаў, той жа Ян Вісліцкі).

Аўтары не праводзяць аналіз усяго мінулага, яны акцэнтуюць увагу на пэўных часах, падзеях, постацях. Найчасцей станоўчы прыклад у XVI ст. бачылі ў часах Вітаўта і Ягайлы. Яны звычайна паказаны як ідэальныя вобразы. Нават у Стрыйкоўскага, дзе апісанне мінулага ВКЛ носіць «універсальны» характар, менавіта Вітаўт (а таксама Ягайла) выконваюць ролю ідэальных уладароў, а іх эпоха – годнай вяртання.

Знітаванне мінулага і сучаснасці ў аўтараў адбываецца праз шэраг сімвалаў. Найбольш распаўсюджанай парай сімвалаў з'яўляецца «продкі – нашчадкі». Але яна можа адлюстроўваць розныя сітуацыі: нашчадкі згубілі вартасці продкаў (Гусоўскі, Міхалон Літвін, Ратундус, Волян, «Меркаванні», Стрыйкоўскі ў «Хроніцы»), нашчадкі засвоілі і нават узвысілі годнасць продкаў (Вісліцкі), толькі частка (хоць і большая) нашчадкаў згубілі цноты продкаў (Стрыйкоўскі ў «Ганцы цноты»).

Ратундус пазначыў пераход ад шчаслівага мінулага да праблемнай сучаснасці ВКЛ, назваўшы яго «odmiana» («змена», «змяненне», перадусім у словазлучэнні «odmiana wiary», але праз гэта і нораваў і г. д. [10, s.29]). У «Хроніцы» Стрыйкоўскага, як і ў Ратунда, гэты сімвал набывае негатыўнае значэнне. Так, напрыклад, змяніць можа шчасце [12, s.227]. «Odmiana» (менавіта ў горшы бок) адбываецца не толькі з людзьмі, але і з прыродай [12, s.177], гарадамі (напрыклад, Кіеў [12, s.155], Кернаў [12, s.355]).

«Odmiana» імпліцытна прысутнічае і пры разглядзе Стрыйкоўскім сацыяльнай структуры грамадства, якую ён выводзіць з біблейскіх часоў. Змены («як цяпер у нас робіцца з вялікай шкодай Рэчы Паспалітай») прыводзяць да таго, што «ніводная манархія, ніводнае каралеўства праіснаваць доўга не можа» [12, s.8]. Падобныя ж думкі выказаны яшчэ ў адным творы Стрыйкоўскага – «Ганцы цноты» [13, ss.483–484]. Таксама ў «Ганцы цноты» «odmienność» супрацьпастаўляецца «трыванню ў цноце» [13, s.479]. Хоць тут Стрыйкоўскі адзначае і варыянт «odmiany» наадварот – «odmiana piękniejsza» [13, s.480]. Адмоўнае стаўленне да зменаў, нavaтвораў – яшчэ адна рыса скіраванай да мінулага свядомасці.

Уласна сама сувязь паміж мінулым і сучаснасцю адыгравала ролю своеасаблівага сімвалу, які шырока выкарыстоўваўся ў грамадскай думцы ВКЛ XVI ст.

## Літаратура


1. *Вісліцкі Я.* Пруская вайна = Bellum Prutenum: збор твораў / Укладанне, пер. на бел. мову, уст. артыкул, кароткі слоўнік антычных і сярэднявечных намінацый, камент. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай; Навук. рэд. У. Г. Кароткі, А. З. Цысык. Мн., 2005.
2. *Гусоўскі М.* Песня пра зубра: паэма / Пер. с лацінск. мовы і паслясл. Я. Семяжона; Іл. А. Кашкурэвіча. Мн., 1973.
3. *Кавалёў С. В.* Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесансу. Мн., 2002.
4. *Литвин М.* О нравах татар, литовцев и москвитян / Пер. В. И. Матузовой; Вступ. ст. М. В. Дмитриевой; Коммент. С. В. Думина и др. М., 1994.
5. *Barthes R.* Historia czy literatura? / Przekład W. Błońskiej // Pamiętnik Literacki. 1969. R. LX. Z. 4. S. 253–268.
6. *Korzeniowski J.* Wstęp // Rozmowa Polaka z Litwinem. Kraków, 1890. S. III–VIII.
7. *Orzechowski S.* Dyalog, albo rozmowa około exekucyi Polskiej korony, przez Stanisława Orzechowskiego / Wyd. K. J. Turowskiego. Kraków, 1858.
8. *Orzechowski S.* Quincunx, to jest Wzór korony polskiej na cynku wystawiony, przez Stanisława Orzechowskiego Okszyca z Przemyskiej ziemi i na kolędę posłom koronnym do Warszawy na nowe lato roku pańskiego 1564 posłany / Wyd. K. J. Turowskiego. Kraków, 1858.
9. *Pomian K.* Historia między retoryką a teologią. Niektóre problemy myśli historycznej doby Odrodzenia i Reformacji // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 1964. № 9. S. 23–74.
10. Rozmowa Polaka z Litwinem / Wyd. J. Korzeniowski. Kraków, 1890.
11. *Smereka J.* Wstęp // Wojna Pruska / Jan z Wiślicy. Lwów, 1932. S. 8–38.
12. *Stryjkowski M.* Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego: 2 t. / Przedmowy M. Malinowskiego, I. Daniłowicza. Warszawa 1846. T. 1. 1846.
13. *Stryjkowski M.* Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego: 2 t. / Przedmowy M. Malinowskiego, I. Daniłowicza. Warszawa 1846. T. 2. 1846.

14. *Szacki J.* świadomość historyczna a wizja przyszłości // Dylematy historiografii idei oraz inne szkice i studia. Warszawa, 1991. S. 266–284.
15. Zdanie o obieraniu nowego króla // Pisma polityczne z czasów pierwszego bezkrólewia / Wyd. J. Czubek. Kraków, 1906. S. 349–355.

## МАГІСТРАТ ГОРАДА ДЗІСНЫ Ў XVI–XVIII СТСТ.

**А. В. Грыб**

Горад Дзісна ў XVI–XVIII стст. – сярэдні па памерах гандлёвы гарадок. Яго насельніцтва вагалася ў межах 2–3 тысяч чалавек (для параўнання: сучаснае насельніцтва – каля 2,5 тыс.). Мяшчане займаліся пераважна гандлем з Рыгай (вывозілі лён, каноплі, пяньку, лес, паташ і інш. сыравіну). У горадзе было добра развіта рамяство: існавала 9 цэхаў, акрамя цэхавых майстроў была вялікая колькасць прафесій, якія з-за малалікасці не маглі ўтварыць цэха [1, р.165]. Першапачаткова горад утварыўся каля замку, які быў пабудаваны ў 1560-х гадах на месцы старажытнага гарадзішча Полацкага княства. Замак найбольшай магутнасці дасягнуў пры каралі Стэфане Баторыі, які перад паходам на Полацк у 1579 г. збіраў войска пад Дзіснай. Замак не захаваўся да нашага часу, ён быў узарваны шведамі ў часе Паўночнай вайны.

Гарадское самакіраванне ў Дзісне ажыццяўлялася на аснове магдэбургскага права, падобна да таго, як кіраваліся іншыя гарады ў ВКЛ. Прынцыпы самакіравання закладваліся ў прывілеях гораду на магдэбургскае права. Першы прывілей на магдэбургскае права быў нададзены 20 студзеня 1569 года на сойме ў Любліне. У ім дакладна агаворвалася пра гарадскія ўрады, прыбыткі магістрату, правы і абавязкі мяшчан адносна вялікакняскага скарбу [2, р.226–230; 3, с.164–169]. Кожны наступны манарх пацвярджаў усе гэтыя палажэнні праз выданне канфірмацыйнага прывілея. Акрамя прывілея на магдэбургскае права былі выяўлены іншыя прывілеі дзісненскім мяшчанам, якія паступова ўключаліся ў канфірмацыйныя прывілеі [4, арк.10адв.–18адв.]. Усе прывілеі выдаваліся на неабмежаваны час («на вечнасць») каралём, які лічыўся намінальным уласнікам горада.

Магістрат горада Дзісны складаўся з рады і лавы. Дакладна невядома, ці быў гэты падзел пастаянны, ці гэтыя палажэнні змяняліся цягам часу. Устаноўлена, што большасць выракаў магістрацкага суду і іншыя рашэнні магістрату звычайна складаліся ў прысутнасці бурмістраў, радцаў і лаўнікаў. З гэтага можна зрабіць выснову, што ў дзісненскім магістраце большасць паседжанняў адбывалася сумесна з удзелаў і рады, і лавы. Калі ўлічыць, што Дзісна была невялікім горадам, то верагодна,